Среди словесных товарных знаков в последнее время все чаще встречаются предложения естественного языка, поскольку они обладают большим набором выразительных средств, способных повлиять на выбор потребителя.

В качестве товарных знаков используются как простые, так и сложные предложения (**8,4%**): *Salut! Heute ist Trumpf*; *Morgens halb zehn in Deutschland*; *Und wieder blüht der Mohn*; *Ich hab dich lieb Herzen*; *Schokolade, die verzaubert*; *Lass die Alpen glühen*.

Предложения, входящие в состав товарных знаков Германии, отличаются своей преимущественной полнотой. Как правило, присутствует как подлежащее, так и сказуемое, т.к. в немецких предложениях их наличие является обязательным.

Необходимо отметить, что имена существительные в составе словесных товарных знаков Германии чаще используются без артикля, несмотря на важность категории определенности / неопределенности в немецком языке.

Заключение. Таким образом, словесные товарные знаки Германии представлены отдельными словами (в том числе сложными), словосочетаниями и предложениями. Большую часть проанализированных товарных знаков составляют имена существительные, которые чаще используются без артикля. Использование сложных слов обусловлено особенностями языковой системы и стремлением к экономии языковых средств. Словосочетания используются реже. Выявлены товарные знаки-предложения, характеризующиеся преимущественной полнотой.

Список литературы

1. Соболева, Т.А. Товарные знаки / Т.А. Соболева, А.В. Суперанская. – М.: Наука, 1986. – 176 с.

ГІСТАРЫЧНЫ РАМАН З ЭЛЕМЕНТАМІ ДЭТЭКТЫЎНАСЦІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Г.В. Навасельцава
Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

Мастацкая практыка пачатку XXI стагоддзя сведчыць пра актуалізацыю падзейнага напрамку ў асэнсаванні пісьменнікамі гісторыі. Дынаміка аповеду і займальнасць, уключэнне дэтэктыўных момантаў выкарыстоўваюцца імі пры ўвасабленні складаных, раней мала асветленых момантаў сусветнага і беларускага мінулага ў жанры рамана. Паспяховым мастацкім прыкладам гістарычнага рамана з элементамі дэтэктыўнасці можна назваць знакаміты твор Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». Так, дэтэктыўная інтрыга арганізуе сюжэт рамана вакол расследавання злачынстваў прадстаўнікоў рода Альшанскіх, патрабуе ад апавядальніка Антона Косміча добрага ведання гісторыі дзеля раскрыцця таямніц мінулага. Гэта абумоўлівае мэту даследавання – раскрыць эстэтычную характарыстыку гістарычнага рамана з элементамі дэтэктыўнасці ў сучаснай беларускай літаратуры.

Матэрыял і метады. Для літаратуразнаўчай ацэнкі раманнай трылогіі «Пан Кміціч» М. Галдзянкова, раманаў «Перамагаючы – азірніся», «Попел і снег» С. Зайцава былі выкарыстаны асноўныя прынцыпы культурна-гістарычнага метада ў спалучэнні з элементамі кампаратыўнага і кантрастыўнага аналізу.

Вынікі і іх абмеркаванне. Паводле А.Г. Баканава, «існуюць творы, дзе гісторыя з'яўляецца ўмоўнай і становіцца сюжэтна-вобразнай глебай для ідэйнай будовы, што далёка адыходзіць ад непасрэдна філасофскага, сацыяльнага і маральнага сэнсу канкрэтных эпізодаў мінулага» [1, с. 24]. Да інтэрпрэтацыі гісторыі ў дэтэктыўным рэчышчы звяртаецца Эдуард Скобелеў. Пад прыватны дакумент мінулага стылізаваны раман пісьменніка з элементамі дэтэктыву «Сведка: (запіскі капітана Цімкова)» (1986). Там узнаўляліся падзеі другой паловы XVIII стагоддзя, асэнсоўваліся актуальныя і для пісьменніцкага часу маральна-этычныя пытанні наконт таго, павінен чалавек аддаваць перавагу сумленнаму служэнню грамадству ці толькі ў карыслівых мэтах выкарыстоўваць сваё службовае становішча. Апавядальнік капітан Цімкоў – асоба, якая не губляе разважлівасці ўдумлівага летапісца. Ён сведка драматычных гістарычных падзей, праз яго бачанне характарызуюцца масонскі рух сярод арыстакратаў, канфлікт паміж Кацярынай II і Пятром III, які перарастае ў дзяржаўны пераварот. Цімкоў ненавідзіць прыстасаванцаў, якіх шмат і сярод сваіх, і сярод «находнікаў». Ён не губляе аб'ектыўнасці ў ацэнцы дзейнасці Пятра III, што мае шмат чалавечых слабасцей, і атачэння

Репозиторий ВГУ

імператара, што выкарыстоўвае ў карыслівых мэтах сваю набліжанасць да трона. Лейтматывам у рамане стаў пошук адказу на пытанне, чаму сапраўды рускія людзі заўсёды чужыя ў Расіі. У працэсе гэтага раскрываецца філасофскі роздум пра лёс патрыёта. Цімкоў ненавідзіць крывадушнасць Кацярыны, але па сваёй сутнасці ён сведка, а не дзейная асоба. Дэтэктыўная форма асэнсавання гістарычнага мінулага нязменна выклікала чытацкую цікавасць.

У сучаснай прыгодніцкай лініі мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі абазначылася некалькі напрамкаў, дзе запатрабаваная не столькі дэтэктыўная форма ўвасаблення мінулага, колькі падзейны сюжэт з элементамі дэтэктыўнасці. Па-першае, гэта паказ найперш гістарычных падзей і звязаных з імі чалавечых лёсаў пэўнага часу на аснове прынцыпу мастацкага гістарызму з выкарыстаннем алюзій, рэмінісцэнцый («Знак вялікага магістра», 2008, В. Іпатавай; «Золата забытых магіл», 2003, і інш. Л. Рублеўскай; рускамоўная трылогія «Пан Кміціч», 2012, М. Галдзянкова). Неадназначныя адносіны, з пункту гледжання ўвасаблення гістарычных асоб, выклікае, напрыклад, цыкл раманаў «Пан Кміціч», што складаецца з кніг: «Вогненны вершнік» (2011), «Сцежкаю ваўка» (2011), «Паядынак» (2012) пра трагічныя моманты вайны 1654–1667 гадоў на беларускай зямлі. Пісьменнік узнавіў пачатак вайсковых дзеянняў, грамадскія настроі падчас ваеннага ліхалецця і па заканчэнні вайны Масковіі з Рэччу Пасталітай. Несумненная вартасць раманнага цыкла ў імкненні аўтара дэталёва перадаць атмасферу складанага перыяду. М. Галдзянкоў звярнуўся да ўвасаблення жыцця сапраўдных гістарычных асоб, шмат увагі надаў гісторыка-этнаграфічным рэаліям. Галоўны герой трылогіі – аршанскі шляхціц Самуэль Кміціч, пляменнік Філона Кміты-Чарнабыльскага, славуты сваімі подзвігамі на вайне 1654–1667 гадоў. Гэта гістарычная асоба стала прататыпам Анджэя Кміціца ў рамане Г. Сянкевіча «Патоп» (1886). Г. Сянкевіч і М. Галдзянкоў апавядалі пра перыяд, калі Рэч Паспалітая з'яўлялася арэнай барацьбы шведскіх і маскоўскіх войскаў, калі рускі цар Аляксей Міхайлавіч прагнуў пашырыць межы маскоўскага царства і атрымаць каралеўскую карону, шведскі кароль Карл X Густаў захопліваў польскія землі, а польскі кароль Ян Казімір праяўляў слабасць і нерашучасць. У такіх абставінах уплывовыя магнаты Радзівілы хацелі аддзяліць Вялікае княства Літоўскае ад Рэчы Паспалітай. Г. Сянкевіч паказвае найперш шведскі «патоп», беларускі ж пісьменнік галоўным чынам прасочвае падзеі вайны з Масковіяй. Абодва аўтары захапляюцца гераічным учынкам Кміціча пры абароне Чанстахоўскага манастыра. Разам з тым Сянкевіч падкрэсліў самавольства Анджэя, які разганяе мясцовы соймік, выкрадае панну Аляксандру Білевіч, здзекуецца і забівае шляхціцаў і таму вымушаны працягваць далейшае змаганне пад прозвішчам «Бабініч». Думаецца, гэтым пісьменнік хацеў паказаць розніцу паміж рыцарам з этнічнай Польшчы і рыцарам з Літвы. Галдзянкоў жа падае свайго героя ўзорам рыцарскіх паводзін. Беларускі пісьменнік супярэчыць Сянкевічу і трактоўкай вобразаў князёў Радзівілаў. Калі для польскага аўтара Януш і Багуслаў Радзівілы – здраднікі, што імкнуцца забіць караля дзеля ўласнага ўзвышэння, то Галдзянкоў адзначае патрыятызм Радзівілаў. Цікава, што ў рускамоўным творы князі Радзівілы размаўляюць па-беларуску. Братазабойчая вайна, у якой гінуць лепшыя прадстаўнікі шляхты, становіцца ў рамане прадметам мастацкага даследавання, асабліва ў рамане «Сцежкаю ваўка». Спалучэнне прыгодніцкіх элементаў, дакументальнасці і мастацкага вымыслу дало М. Галдзянкову мажлівасць для ўвасаблення часу, калі вайна стала ладам дзяржаўнага жыцця, але пры гэтым аўтар адхіліўся ад рэальнай гісторыі.

Па-другое, гэта творы, у якіх гісторыя – фон для захапляльнага аповеду пра прыватныя чалавечыя лёсы, дзе на перыферыі сюжэта могуць эпізадычна з'яўляцца гістарычныя асобы («Перамагаючы – азірніся»,1986, «Попел і снег», 2003, рускамоўнага пісьменніка С. Зайцава). Так, у рамане С. Зайцава «Перамагаючы – азірніся» расказваецца пра жыццё ўсходніх славян у IV стагоддзі, фонава згадваюцца працэсы племяннога аб'яднання на тэрыторыі сучаснага Прыдняпроўя, заняпад Вялікай Рымскай імперыі, шматлікія напады готаў і гунаў – «варвараў», – паводле рамеяў, заснаванне Канстанцінопаля, скліканне Першага Усяленскага сабора і ўзнікненне арыянства. «Попел і снег» – раман пра напалеонаўскае нашэсце. Адступленне рускіх войскаў на пачатку ваеннай кампаніі, Барадзінская бітва, захоп французамі Масквы, іх адступленне па старой Смаленскай дарозе паказваюцца вачыма герояў, што знаходзяцца ў супрацьлеглых лагерах, – полацкага лекара Аляксандра Мантуса і капрала французскай арміі Анры Дзюплесі, шчырага прыхільніка Напалеона, актыўнага ўдзельніка ваенных паходаў. Па-трэцяе, гэта колькасна нешматлікая лінія, скіраваная на парадзіраванне гісторыі (рускамоўны раман-дысертацыя «Карона Вялікага княства» (1999) У. Бутрамеева).

Репозиторий ВГУ

Заключэнне. Падзейны напрамак у інтэрпрэтацыі гісторыі беларускімі празаікамі канца ХХ стагоддзя істотна розніўся ад так званай забаўляльнай літаратуры, бо прыгодніцкая лінія ўжывалася не толькі для таго, каб забаўляць чытача, а каб дынамізаваць аповед, актывізаваць чытацкую цікавасць да гісторыі роднай зямлі. Аднак апошнім часам пісьменніцкая інтэрпрэтацыя гісторыі стала развівацца па лініі, абвешчанай Аляксандрам Дзюма, дзе аўтар мае поўную свабоду ў мастацкім мадэляванні гістарычных падзей і асоб, што зніжае пазнавальны патэнцыял твораў і не заўсёды павышае іх эстэтычны ўзровень.

Спіс літаратуры

1. Баканов, А.Г. Современный зарубежный исторический роман / А.Г. Баканов. – Киев : Вища шк., 1989. – 184 с.

АБ ХАРАКТАРЫ НАЗОЎНІКАЎ З АДЦЯГНЕНЫМ ЗНАЧЭННЕМ У КІТАБЕ ХІХ СТ.

В.І. Несцяровіч
Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

Артыкул прысвячаецца агляду засведчанай у кітабе першай трэці ХІХ ст. лексіцы з адцягненым значэннем. Арыенталізмы, якімі абазначаюцца разнастайныя абстрактныя паняцці рэлігійнага або свецкага характару, у публікацыі не разглядаюцца. Тэрміны *адцягнены* і *абстрактны* ў дачыненні да лексікі прымяняюцца як раўнапраўныя, нягледзячы на рознае трактаванне іх значэнняў некаторымі лінгвістамі.

Актуальнасць даследавання вызначаецца выкарыстаннем вывадаў, якія прыводзяцца ў публікацыі, пры вырашэнні праблемы пераемнасці паміж старабеларускай і новай беларускай літаратурнай мовамі. Мэтай даследавання з'яўляецца аналіз адцягненай лексікі ў кітабе ХІХ ст., асаблівасцей яе словаўтварэння і семантыкі.

Матэрыял і метады. Матэрыялам даследавання паслужыў Кітаб А. Хасяневіча (1832). Для аналізу лексікі з адцягненым значэннем выкарыстоўваліся метады словаўтваральнага і лексікаграфічнага апісання, дыстрыбутыўны і статыстычны метады.

Да лексікі з адцягненай семантыкай аўтарам адносяцца словы са значэннем прыметы або якасці, якія на ўзроўні лагічнага асэнсавання становяцца самастойнымі прадметамі думкі, а на лінгвістычным – маюць адпаведнае лексіка-граматычнае афармленне ў манускрыпце: *жаданйе, вернасц, лакомства* 'прагнасць, сквапнасць' і да т.п. (тут і далей курсівам падаюцца транслітараваныя з арабскага пісьма словы і сказы).

У гісторыі славянскага мовазнаўства вядомы і падрабязна апісаны розныя канцэптуальныя падыходы ў вылучэнні адцягненай лексікі – марфалагічны, словаўтваральны, сінтаксічны, семантычны, стылістычны. Яшчэ адзін падыход – лагічны – прапануецца ў публікацыях Кацярыны Борушкінай [1]. На думку даследчыцы, падобная лексіка ўзнікла ў выніку ізалявальнага (ад самога прадмета) абстрагавання.

Прапанаваны падыход прымяняецца і пры аналізе адцягненай лексікі кітаба ХІХ ст. – помніка ісламскай пісьмовай культуры, у склад якога ўваходзяць рэлігійныя (пераважна), фальклорныя і літаратурныя творы і ў якім дамінуючай з'яўляецца тагачасная беларуская мова. Аб'ём адцягненай лексікі кітаба складае не менш за 550 лексем (асобныя напісанні патрабуюць дадатковага графалагічнага і этымалагічнага высвятлення, з гэтай прычыны прыведзеныя ў публікацыі статыстычныя даныя носяць папярэдні характар). У склад адцягненай лексікі ўключаюцца толькі назоўнікі, таму што толькі з іх дапамогай можна "субстантываваць акцыдэнцыю, г. зн. выказаць у маўленні адцягненую ад носьбіта і сітуацыі (ладу, часу, ліку і г. д.) якасць або дзеянне [2]; застаюцца па-за межамі адцягненай лексікі гіперонімы, зборныя і субстантываваныя прыметнікі.

Вынікі і іх абмеркаванне. Паводле паходжання назоўнікі з адцягненым значэннем у Кітабе А.Хасяневіча аб'ядноўваюцца ў наступныя групы:

а) назоўнікі агульнаславянскага паходжання, утвораныя пры дапамозе старажытных фармантаў, якія ў цяперашні час як асобныя марфемы не выдзяляюцца;

б) назоўнікі, утвораныя шляхам афіксацыі;

в) іншамоўныя назоўнікі;

г) адцягненыя назоўнікі, якія ўзніклі семантычным шляхам.

Найбольш старажытную паводле паходжання групу складаюць словы першай групы – з нулявымі (з пазіцыі сінхроннага вывучэння) суфіксамі. Лічыцца, што яшчэ ў агульнаславянскі

Репозиторий ВГУ